1993–2016. – Cz. 5, t. 2: Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa Brzeskolitewskiego / A. Oleńska [i inn.]. – 2014. – 456 s.

17. *Meysztowicz, W.* Dobra kościelne jako przedmiot uprawnień w prawie W. Ks. Litewskiego / W. Meysztowicz – Wilno: Z zasiłku Funduszu Kultury Narodowej, 1935. – 176 s.

18. *Ochmański, J.* Powstanie i rozwój latyfundium biskupstwa wileńskiego, 1387–1550: ze studiów nad rozwojem wielkiej własności na Litwie i Białorusi w średniowieczu / J. Ochmański. – Poznań: Wydawnictwo Uniwersytetu im. A. Mickiewicza, 1963. – 236 с.

19. *Siekierski, M.* Landed wealth in the Grand Duchy of Lithuania: the economic affairs of Prince Nicholas Christopher Radzwiłłł (1549–1616).

20. Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich: 15 t. / pod red. F. Sulimierskiego [i inn.]. – Warszawa: Wiek, 1880–1902. – T. 1 / F. Sulimierski. – 1880. – 960 s.

21. Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich: 15 t. / pod red. F. Sulimierskiego [i inn.]. – Warszawa: Wiek, 1880–1902 / F. Sulimierski. – 1890. – T. 11. – 960 s.

22. Volumina Legum. Przedruk zbioru praw: 8 t. / red. J. Ochryszko. – Petersburg: Nakład i druk Jozafata Ochryszki, 1859–1860 / J. Ochryszko. – 1860. – T. 4: Ab anno 1641 ad annum 1668. – 501 s.

23. *Wyrobisz, A*. Rola miast prywatnych w Polsce w XVI i XVII wieku / A. Wyrobisz // Przegląd historyczny 65/1, 19–46. – 1974.

**(Дата падачы: 26.02.2021 г.)**

*Н. А. Пятрэнка*
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Віцебск

*N. Piatrenka*
Vitebsk State University P. M. Masherova, Vitebsk

**УДК 930.1(476)**

# ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ АСНОЎНЫХ ПАКАЗЧЫКАЎ РАЗВІЦЦЯ САЦЫЯЛЬНАЙ ІНФРАСТРУКТУРЫ Г. ВІЦЕБСКА Ў 1941 І 1944 ГГ.

# COMPARATIVE ANALYSIS OF THE MAIN INDICATORS OF THE SOCIAL INFRASTRUCTURE DEVELOPMENT OF VITEBSK IN 1941 AND 1944

*У артыкуле здзейснены параўнальны аналіз даваенных і пасляваенных паказчыкаў развіцця сацыяльнай інфраструктуры г. Віцебска. Да падзей Вялікай Айчыннай вайны сацыяльна-эканамічны патэнцыял г. Віцебска меў станоўчую тэндэнцыю развіцця. 26 чэрвеня 1944 г. у горадзе засталося менш за 1 % насельніцтва, 6.4 % жылога фонду і 3 % прамысловых аб'ектаў ад паказчыкаў 1941 г. Камунальная гаспадарка і інжынернае абсталяванне былі ў поўным заняпадзе. Даследаванне маштабаў разбурэнняў гарад-*

*скай інфраструктуры стварае аснову для наступнага вывучэння працэсаў пасляваеннага аднаўлення г. Віцебска. Даследаванне грунтуецца на прынцыпах аб'ектыўнасці і гістарызму, у аснову пакладзены гісторыка-параўнальны і гісторыка-сістэмны метады.*

*Ключавыя словы: Віцебск; беларускі савецкі горад; сацыяльная інфраструктура; добраўпарадкаванне; камунальна-інжынернае абсталяванне.*

*The article presents a comparative analysis of the pre-war and post-war indicators of the development of the social infrastructure of Vitebsk. Before the events of the Great Patriotic War, the socio-economic potential of Vitebsk had a positive development trend. As of June 26, 1944, less than 1 % of the population, 6.4 % of the housing stock, and 3 % of the industrial facilities remained in the city since 1941. Public utilities and engineering equipment were in complete decline. The study of the scale of the destruction of urban infrastructure provides a basis for further study of the post-war reconstruction of Vitebsk. The research is based on the principles of objectivity and historicism, based on historical-comparative and historical-systematic methods.*

*Keywords: Vitebsk; Belarusian Soviet city; social infrastructure; landscaping; municipal engineering equipment.*

Паспяховае паступальнае развіццё сацыяльнай інфраструктуры г. Віцебска даваеннага перыяду было парушана падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Параўнальны аналіз ажыццяўляўся па паказчыках развіцця дэмаграфічнай дынамікі, асаблівасцяў прамысловага і жыллёвага будаўніцтва, стану камунальна-інжынернага абсталявання і добраўпарадкавання гарадской тэрыторыі. Даследаванне ажыццяўлялася з прыцягненнем у навуковы абарот дакументальных матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, а таксама прааналізаваных публікацый даследчыкаў па пытаннях развіцця г. Віцебска ў вызначаны перыяд.

У артыкуле пастаўлена мэта правесці параўнальны аналіз даваеннага і пасляваеннага становішча г. Віцебска па асноўных паказчыках развіцця сацыяльнай інфраструктуры.

У 1920–1930-я гг. у г. Віцебску назіралася станоўчая тэндэнцыя павелічэння колькасці насельніцтва, гэтаму садзейнічала актыўнае прамысловае будаўніцтва. Згодна перапісу наслельніцтва 1939 г., колькасць жыхароў г. Віцебска складала 168 тыс., а непасрэдна перад вайной дасягнула 207 тыс. чалавек [1, арк. 8]. Трэба адзначыць, што непасрэдна ў горадзе пражывала 180 тысяч чалавек, а на прыгарадскіх тэрыторыях яшчэ 27 тыс. [2, арк. 194]. Гэта была даволі вялікая колькасць насельніцтва для таго часу, што рабіла даваенны г. Віцебск адным з буйнанаселеных гарадоў Савецкай Беларусі.

На 26 чэрвеня 1944 г., згодна з дадзенымі дакладной запіскі загадчыка Віцебскай абласной камісіі В. Кудраева, у горадзе засталося ўсяго 118 чалавек, што складала меней за 1 % ад даваеннай колькасці насель-

ніцтва [1, арк. 8]. За перыяд вайны вялікая частка насельніцтва загінула, а астатняя знаходзілася ў міграцыйных працэсах ваеннага часу. Нягледзячы на тое, што насельніцтва паступова павялічвалася дзякуючы жыхарам, якія вярталіся ў горад, менавіта гэтыя страты былі самымі трагічнымі. Акрамя маральнага боку, гэта ўздзейнічала і на матэрыяльны бок, бо адсутнасць працоўных рук запавольвала рэалізацыю аднаўленчых мерапрыемстваў.

Згодна з дадзенымі Віцебскай гарадской інспектуры дзяржаўнай статыстыкі, на 1 студзеня 1941 г. жыллёвы фонд горада налічваў 20 244 будынкі з жылой плошчай 824 110 квадратных метраў. Пры колькасці насельніцтва ў 207 тысяч на аднаго чалавека даводзілася 3,9 квадратных метра жыллёвай плошчы. Размеркаванне жыллёвага фонду адпавядала ўласнасці гарсавета – 11 209 будынкаў з плошчай 385,3 тыс. квадратных метраў, ведамаснага карыстання – 850 будынкаў з плошчай 110,5 тыс. квадратных метраў, прыватнай маёмасці – 8185 будынкаў з плошчай 378,3 тыс. квадратных метраў [1, арк. 10]. У сістэме гарадской камунальнальнай гаспадаркі знаходзілася 564 234 квадратных метраў, а ў прыватнай уласнасці – 259 876 квадратных метраў [2, арк. 194]. Такім чынам, у даваенным г. Віцебску, як і ва ўсіх вялікіх гарадах з актыўным прамысловым развіццём, нягледзячы на станоўчы рост будаўніцтва, назіралася вострая праблема з жыллём.

Пасля вызвалення горада ад фашысцкіх захопнікаў жыллёвы фонд страціў 93 % аб’ектаў: з 824 110 квадратных метраў засталося 57 600, у тым ліку па камунальнаму фонду 28 350 квадратных метраў [3, арк. 67]. Згодна з дадзенымі Віцебскай гарадской інспектуры дзяржаўнай статыстыкі, стан будынкаў жыллёвага фонду выглядаў наступным чынам: 70,1 % былі поўнасцю знішчаны, 23,5 % патрабавалі капітальнага рамонту і 6,4 % ацалелі, аднак патрабавалі бягучага рамонту. Агульная плошча знішчэнняў жыллёвага фонду адпавядала стратам ўласнасці гарсавета на 94,8 %, ведамаснага карыстання на 92,4 %, прыватнай маёмасці на 94,8 % [1, арк. 10]. У горадзе засталося меней 7 % непашкоджанных жылых памяшканняў, першапачаткова выкарыстоўваліся любыя ацалелыя будынкі і нават зямлянкі. Трэба падкрэсліць той факт, што калі да 1941 г. у горадзе існавала жыллёвая праблема, то пасля вайны гэта была жыллёвая катастрофа.

За 1920–1930-я гг. у г. Віцебску адбывалася актыўнае будаўніцтва новых прамысловых аб’ектаў. Асноўны прамысловы профіль на 56,3 % прыходзіўся на легкую прамысловасць, 5,4 % – дрэваапрацоўку, 4,7 % – станкабудаўніцтва і металаапрацоўку [1, арк. 4]. У горадзе працаваў шэраг вялікіх прадпрыемстваў: станкабудаўнічыя заводы імя Кірава і Камінтэрна, панчошна-трыкатажныя фабрыкі імя Клары Цэткін і КІМ, швейныя фабрыкі Сцяг Індустрыялізацыі і Прафінтэрн, абутковыя фабрыкі Чырвоны Кастрычнік і Прагрэс, Ільнопрадзільная фабрыка імя Кагановіча і іншыя. На вялікіх прамысловых аб’ектах налічвалася 24 100 працоўных, а на мелкіх прадпрыемствах (191) – 21 524 працоўных, што разам складала амаль

пятую частку ад насельніцтва горада [2, арк. 193]. Прамысловае будаўніцтва было важным градафарміруючым і дэмаўтваральным фактарам і даваенны г. Віцебск меў дастаткова добрую сетку прамысловых аб’ектаў.

У першыя дні вайны ў горадзе распачалася эвакуацыя, што закранула 37 прамысловых аб’ектаў. Былі вывезены 2300 вагонаў з прамысловым абсталяваннем і прадукцыяй, а таксама частка працоўных. Будынкі фабрык і заводаў сталі аб’ектамі для знішчэння. У горадзе на дзень вызвалення зберагліся меней 3 % прамысловых даваенных аб'ектаў і нават тыя будынкі, што хоць крыху ацалелі патрабавалі сур’ёзнага рамонту і іх цяжка было прыстасаваць да працы прамысловага і вытворчанга прызначэння [4, с. 41]. Такім чынам, амаль усе прамысловыя будынкі былі страчаны, а абсталяванне альбо знішчана, альбо вывезена. Кіраўніцтва і жыхары горада былі вымушаны аднаўляць прамысловы комлекс амаль поўнасцю.

Даваенны г. Віцебск меў дастаткова добрую тэндэнцыю сацыяльна-бытавога і культурнага развіцця. У горадзе было чатыры вышэйшыя ўстановы адукацыі (2500 студэнтаў), 15 сярэдніх і спецыяльных навучальных устаноў (4300 навучэнцаў), 43 сярэдніх і пачатковых школы (24 000 вучняў), 55 дзіцячых садкоў (3800 дзяцей), а таксама спецыяльныя школы для сляпых, глуха-нямых, цыганская школа (355 вучняў), сем школ ФЗН (1700 навучэнцаў). У горадзе налічвалася 51 сталовая, рэстаран і фабрыка-кухня, 99 закусачных, 336 крамаў, 122 палаткі, 19 клубаў з кінаперасоўкамі, два тэатра, цырк, тры кінатэатра. У горадзе мелася 11 стацыянарных медыцынскіх устаноў з 1507 месцамі, з іх 9 бальніц, 2 радзільных дома, 14 здраўпунктаў, 33 амбулаторна-паліклінічных установы, у тым ліку 2 спецыялізаваных дыспансэра, адна дзіцячая паліклініка, 11 дзіцячых і жаночых кансультацый, 10 рэнтгенаўскіх установак, 8 аптэк. Хуткая дапамога мела 16 аўтамашын і санітарна-эпідэміялагічную станцыю. За перыяд ваенных дзеянняў спалілі і разбурылі педагагічны і медыцынскі інстытуты, Дом Чырвонай Арміі, педагагічнае вучылішча, гарадскі тэатр і іншыя буйныя культурныя і бытавыя ўстановы [2, арк. 194]. Будынкі адміністратыўных, грамадскіх і культурна-бытавых устаноў былі альбо поўнасцю страчаны, альбо патрабавалі капітальнага рамонту.

На 1941 г. у г. Віцебску мелася добраўпарадкаванае цэнтралізаванае водазабеспячэнне. Крыніцамі з’яўляліся 2 артэзіянскія гарызонты, што залягалі ў *раскослістых* вапняках. Дадзеныя артэзіянскія свідравіны з водаправоднымі пабудовамі знаходзіліся ў раёне Пяскаваціка з 7 артсвідравінамі, насосна-кампрэсійнай станцыяй, зборным рэзервуарам, у раёне Маркаўшчыны з 3 артсвідравінамі і такімі ж пабудовамі як на Пяскаваціку. Сумарная вытворчасць усіх свідравін складала 25 тыс. кубаметраў вады на суткі [1, арк. 15]. У горадзе працавала 90 водаразборных калонак агульнага карыстання, а таксама забяспечвалася вадой 223 тыс. квадратных метраў жылых кватэр [2, арк. 194]. Згодна справаздачам Віцебскай гарадской інспектуры дзяржаўнай статыстыкі, на 1 студзеня 1941 г. вадаправодная сетка мела агульную працягласць каля

60 кіламетраў. У перыферыйных раёнах асаблівую ролю мелі калодзежы з пітнай вадой, якіх у горадзе налічвалася 1581. Аддзел ачысткі налічваў: 170 коней, 2 аўтамашыны-цыстэрны, 4 грузавыя аўтамашыны. У горадзе было 5 лазняў на 1200 месцаў і механізаваная пральня, а таксама 81 калодзеж сцёкавых вод [3, арк. 67].

За перыяд вайны водаправодная сетка, воданасосныя станцыі і воданапорныя бакі былі поўнасцю страчаны, абсталяванне было альбо знішчана, альбо вывезена акупантамі. Па сутнасці, асноўнымі рэзервуарамі вады, якімі горад карыстаўся пасля вайны, сталі 83 ацалелыя калодзежы. У горадзе засталася толькі адна лазня на 100 месцаў, аднак і тая была на 43 % зруйнаваная [3, арк. 67]. Такім чынам, у даваенным горадзе функцыянавала дастаткова добрая сістэма водазабесячэння, дзе акрамя калодзежаў і калонак існавала сетка камунікацый для ўнутрыквартэрных і прамысловых патрэбаў. Пасля вайны стан камунікацый быў вельмі дрэнны, большая частка абсталявання знішчана альбо вывезена.

У даваенны час г. Віцебск забяспечваўся электраэнергіяй ад гарадской электрастанцыі моцам 2 мегавата і раённай падстанцыі БелГРЭС. У горадзе было 2 паніжальныя падстанцыі: Паўночная і Паўднёвая, якія забеспячваліся праз лінію электраперадачы 110 кілавольт працягам 61 кіламетр. У горадзе мелася 85 трансфарматарных падстанцый з агульным моцам трансфарматараў 21 500 кілават, 46 712 метраў падземных высакавольтных кабельных сетак на 6,6 кілавольт, 23 325 метраў высакавольтных паветраных ліній на 6,6 кілавольт і 120 кіламетраў нізкавольтных ліній. За перыяд акупацыі ў горадзе зберaглі толькі 120 кіламетраў падземнай высакавольтнай сеткі – усё астатняе абсталяванне было страчана [1, арк. 18]. Такім чынам, за перыяд ваенных дзеянняў была поўнасцю страчана магчымасць забяспечваць горад электраэнергіяй.

Да вайны г. Віцебск меў ролю крупнага транзітна-перапрацоўчага пункта. Знешні гарадскі транспарт складаўся з чыгуначнага, паветранага, воднага і аўтагужавага. Праз чыгуначныя шляхі рухаліся грузавыя патокі, якія перапрацоўваліся ў горадзе і накіроўваліся на іншыя пункты. Водныя шляхі забяспечвалі прамысловасць і насельніцтва ў будаўнічых матэрыялах і сельскагаспадарчых прадуктах. Аэрадром служыў ваенным патрэбам, а шасэйныя дарогі зрабілі горад магістральным вузлом [1, арк. 5]. Асноўную ролю ва ўнутрыгарадскім транспартным руху займалі трамвай і аўтобус. Трамвайныя шляхі дасягалі 32 кіламетры, у гарадскім карыстанні было 54 трамвайныя вагоны, 96 аўтобусаў, 776 грузавых і 124 легкавыя аўтамашыны. Гаспадарка трамвая мела цягавую падстанцыю магутнасцю 1800 кілават, парк і дэпо з абсталяваннем, паветраную кантактную сетку працягам 48 кіламетраў, сетку забеспячэння працягам 21 кіламетр, 2 грузавыя вагоны, 1 снегачыст, 5 грузапляцовак, а таскама 7 аўтамашын [2, арк. 194].

У даваенны перыяд у г. Віцебску было два масты праз р. Заходняя Дзвіна, тры – праз р. Віцьба і адзін – праз р. Лучоса, а таксама два чыгуначныя масты праз р. Заходняя Дзвіна. Вуліцы горада і плошчы былі забрукаваны ка-

меннем і асфальтам на 771 100 квадратных метраў, а таксама налічвалася 1843 кіламетры заасфальтаваных тратуараў. На 1 студзеня 1941 г. у горадзе працавалі дамбы па вуліцах Фрунзе, Авіяцыйнай, Крывой і ў раёне Маркаўшчыны. Горад меў 129,5 гектара зялёных насаджэнняў, у тым ліку пад паркі культуры і скверы адпачынку было прыстасавана 17,4 гектара [5, арк. 18]. Згодна з дадзенымі ў горадзе было 9 сквераў, бульвар і парк. У гаспадарцы горада зафіксавана: аранжарэй на 4862 кубічных метраў і пітомнік плошчай 21 гектар, у якіх было высаджана 120 тысяч дэкаратыўных дрэваў, 200 тысяч хмызнякоў, 15 тысяч пладовых дрэваў [3, арк. 67].

За 1941–1944 гг. было страчана ўсё інжынернае абсталяванне і транспарт горада, засталіся толькі трамвайныя шляхі, якія таксама патрабавалі рамонту. На 26 чэрвеня 1944 г. фактычна ўсё покрыва дарог было знішчана, атрымалася зберагчы толькі мост праз р. Заходняя Дзвіна на 209 метраў і мост праз р. Віцьба на 69 метраў, часткова ацалелі дамбы па Авіяцыйнай і Крывой, а таксама ў раёне Маркаўшчыны. Пасля акупацыі засталося толькі каля 30 тысяч дэкаратыўных дрэваў і хмызнякоў, аранжарэі і парнікі былі поўнасцю знішчаны [3, арк. 67]. Такім чынам, гарадская тэрыторыя ў пачатку лета 1944 г. выглядала вельмі дрэнна: усё покрыва дарог, тратуараў, мастоў і вуліц было знішчана, дрэвы і хмызнякі спалены, інжынернае абсталяванне і транспарт страчаны.

Актыўнае развіццё сацыяльнай інфраструктуры г. Віцебска ў даваенны перыяд знайшло адлюстраванне ў паляпшэнні ўмоў жыцця жыхароў горада. Развітыя сістэмы цэнтралізаванага водазабеспячэння і электрычных сетак, сфарміраваныя транспартная і інжынерная інфраструктуры стваралі спрыяльнае гарадское асяроддзе. У той жа час паскораны прамысловы рост і пашырэнне вытворчых плошчаў прывялі да павелічэння колькасці гарадскога насельніцтва, выявіўшы праблему забеспячэння жыллём. Падзеі Вялікай Айчыннай вайны прывялі практычна да поўнага знішчэння гарадской інфраструктуры, разбурэння прамысловых і сацыяльных аб’ектаў. У г. Віцебску захавалася менш за 7 % даваенных аб’ектаў жылога фонду і 3 % прамысловых плошчаў. Камунальная гаспадарка і інжынернае абсталяванне было ў поўным заняпадзе. Неверагодна маштабнымі аказаліся страты мірнага насельніцтва. Дасягненне паказчыкаў развіцця гарадской сацыяльнай інфраструктуры 1941 г. стала асноўнай мэтай аднаўлення г. Віцебска ў першыя пасляваенныя пяцігодкі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 2207. Воп. 2. Спр. 1.
2. ДАВВ. – Ф. 2784. Воп. 1. Спр. 1.
3. ДАВВ. – Ф. 2207. Воп. 1. Спр. 12.
4. *Русецкий, А. В.* Архитектура и градостроительство в художественной культуре Витебщины. С 1918 года и до наших дней / А. В. Русецкий, Ю. А. Русецкий. – Витебск: УО «ВГУ им. П. М. Машерова», 2011. – 180 с.
5. ДАВВ. – Ф. 1972. Воп. 2. Спр. 8.


**(Дата падачы: 25.02.2021 г.)**